**Список используемых источников**

1. *Сидорцов, В. Н.* Научный дискурс историка: социальная обусловленность и методология исследования / В. Н. Сидорцов, А. А. Приборович. – Минск: Изд. центр БГУ, 2013. – 192 с.

2. *Шмидт, С. О.* Архивы и историки-любители / С. О. Шмидт // Памятники письменности в культуре познания истории России. – М.: Языки славянских культур, 2009. – Т. 2. – К. 1. – С. 93.

3. О годе качестве [Электронный ресурс] // Сайт «Архивы Беларуси». – Режим доступа: https://archives.gov.by/home/god-kachestva. – Дата доступа: 13.02.2024.

4. *Рублевская, Л.* Материализованная связь поколений. Как живут белорусские архивы? [Электронный ресурс] / Л. Рублевская // сайт газеты «Звязда». – Режим доступа: https://zviazda.by/ru/news/20220426/1650959398-materializovannaya-svyaz-pokoleniy-kak-zhivut-belorusskie-arhivy#. – Дата доступа: 13.02.2024.

5. Архивная служба Беларуси отметит свое 100-летие [Электронный ресурс] // Информационно-аналитический портал Союзного государства. – Режим доступа: https://soyuz.by/obshchestvo/arhivnaya-sluzhba-belarusi-otmetit-svoe-100-letie. – Дата доступа: 13.02.2024.

6. *Боброва, Е. В.* Архивные информационные ресурсы: результаты опроса пользователей / Е. В. Боброва // Отечественные архивы. – 2022. – № 4. – С. 35–45.

**(Дата подачи: 20.02.2024)**

*А. Р. Раюк*
Минск

*A. Rayuk*
Minsk

**УДК 323.31(476)(043.3)+947.6«1806/1921»**

# НАРАЎЛЯНСКІ МАЁНТАК ДВАРАН ГОРВАТАЎ: АД ЛАТЫФУНДЫІ ДА ФАБРЫЧНАГА ЦЭНТРУ

# THE GORVATT FAMILY'S NAROWLYA ESTATE: FROM THE LATIFUNDIA TO THE FACTORY CENTER

*У артыкуле прасочваецца эвалюцыя нараўлянскага маёнтка дваран Горватаў другой трэці XIX – пачатку XX ст. ад латыфундыі да фабрычнага цэнтру, што было рэалізавана дзякуючы прадпрымальніцкім здольнасцям уладальнікаў.*

*Ключавыя словы: эканамічная гісторыя Беларусі; латыфундыя; прамысловая рэвалюцыя ў Беларусі; Нароўля; Горваты; Эдвард Вайніловіч; Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі.*

*The article traces the evolution of the noble Gorvatt family's Narowlya estate in the second third of the XIX – early XX century from the latifundia to the factory center, which was realized thanks to the entrepreneurial abilities of the owners.*

*Keywords: economic history of Belarus; latifundia; industrial revolution in Belarus; Narowlya; the Gorvatt family; Edward Voinilovich; Minsk agricultural society.*

Нараўлянскі маёнтак каталіцкіх дваран Горватаў у паўднёва-ўсходнім кутку беларускіх губерняў Расійскай імперыі прадстаўляў сабой у XIX – пачатку XX ст. значную латыфундыю, гісторыя якой толькі часткова атрымала сваё апісанне ў навуковых працах, якія ў асобных аспектах нават утрымліваюць недакладнасці, што патрабуе ад гісторыка новага звароту да гэтай тэмы.

Першым, хто сцісла апісаў гісторыю мястэчка Нароўля, быў Аляксандр Ельскі, які ў 1885 г. у артыкуле ў «Геаграфічным слоўніку Польскага каралеўства» адзначыў, што Горваты набылі Нароўлю ў першай палове XIX ст. і маёнтак у 1880-я гг. меў абшар 19 210 дзесяцін зямлі (пераважна лясоў і балот), шыкоўны мураваны палац, каталіцкую капліцу, бровар, значны прыбытак з прапінацыі, млыноў і рыбалоўства [1]. Антоні Урбаньскі ў 1928 г. не канкрэтызаваў ні асобу, ні год куплі Горватамі Нароўлі, а пра Барбароўскі маёнтак напісаў, што першым з Горватаў там асеў мазырскі гродскі суддзя Ігнат Тадэвушавіч Горват [2, с. 113]. Раман Афтаназы ў 1991 г. шырокім дыяпазонам адзначыў, што ў 1810–1820-я гг. Нароўлю купіў Аляксандр Ігнатавіч Горват, а пасля падзяліў паміж сваімі чатырма сынамі сваю латыфундыю, зрабіўшы пачатак чатыром значным дваранскім маёнткам – Барбарову, Нароўлі, Галоўчыцам і Хабну [3, с. 105]. Аднак Аляксандр Горват не меў чатырох сыноў і гісторыя была некалькі іншай.

У 2010 г. Святлана Адамовіч у сваім артыкуле, не пазначаючы крыніцы інфармацыі, указала, што маёнтак Нароўля (з належнымі вёскамі, вінакурнямі і інш.) быў куплены Ігнатам Тадэвушавічам Горватам у спадчынную ўласнасць 1 верасня 1816 г. за суму 242 650 рублёў срэбрам ад дваран фон Гольстаў [4]. І дадала, што Ігнат Горват памёр у 1820 г., а ўся яго латыфундыя перайшла да яго чатырох сыноў (Аляксандра, Станіслава, Атона і Даніэля), тры з якіх не былі паўналетнімі, таму знаходзіліся пад апекай старэйшага – Аляксандра [4]. С. Адамовіч указала, што ў 1825 г. (пасля падзелу бацькавай зямельнай спадчыны) уласнікам нараўлянскага маёнтка стаў Даніэль Ігнатавіч Горват, які пры жыцці ў 1864 г. перадаў вотчыннае права на ўсю нерухомасць сваім сынам – Маўрыцыю і Артуру, з якіх Артур атрымаў маёнтак Нароўля, кошт якога вызначаўся сумай 110 тыс. рублёў срэбрам [4]. А сам Артур Даніэлевіч Горват, паводле даследавання С. Адамовіч, 20 ліпеня 1898 г. перадаў свае права валодання нараўлянскім маёнткам свайму сыну Эдварду Артуравічу Горвату [4].

У дадзеным артыкуле мы з дапамогай адшуканай у архіўных дакументах і статыстычных выданнях інфармацыі ўдакладнім і прасочым зямельна-эканамічную эвалюцыю Нараўлянскага маёнтка ва ўласнасці Горватаў.

Свае вялізныя ўладанні на Нараўляншчыне Ян Мікалай Аскерка ў актах Мазырскага гродскага суда ў 1784 г. называў «Нараўлянскім графствам», а двор у мястэчку Нароўля – «Нараўлянскім замкам» [5, арк. 585, 586]. Пасля канфіскацыі нараўлянскіх маёнткаў Яна Мікалая Аскеркі расійскай уладай у 1794 г. яны адразу сталі па распараджэнні Кацярыны II спадчыннай уласнасцю расійскага графа Якава Сіверса (1731–1808), налічвалі

1396 рэвізскіх душ і цэнтрам мелі ўжо мястэчка Барбароў [6, с. 33]. 11 студзеня 1806 г. упамінаецца, што расійскі дваранін Андрэй Мацвеевіч фон Гольст (каля 1768 – каля 1816) трымаў у Рэчыцкім павеце ў арэндзе маёнтак Барбароў (разам з Нароўляй) ад Якава Сіверса [7, арк. 29]. 8 верасня 1807 г. арандатар Андрэй фон Гольст паведаміў з Барбарова архіепіскапу Мінскаму і Літоўскаму Іову, што ў мястэчку Нароўля ён пабудаваў новую праваслаўную царкву Іаана Багаслова, і прасіў асабіста асвяціць яе вадой 26 верасня 1807 г., аднак Іоў даручыў гэта рэчыцкаму протаіерэю Льву Мясаедаву, што апошні зрабіў у згаданы дзень, а 24 чэрвеня 1808 г. дадаткова асвяціў бакавыя прыдзелы [8, арк. 1–7]. Сам жа Андрэй фон Гольст у Рэчыцкім павеце меў у спадчынным валоданні маёнтак Кажушкі, дзе ў 1808 г. мелася 396 рэвізскіх душ, і трымаў таксама ў арэндзе з 1802 г. тэрмінам на 12 год дзяржаўны маёнтак Мухаеды. Пасля смерці Сіверса яго нашчадкі прадалі ў 1808 г. вялізны маёнтак Барбароў (разам з Нароўляй) Андрэю фон Гольсту. У снежні 1811 г. за Андрэем фон Гольстам у вялізным спадчынным маёнтку Барбароў мелася 2580 рэвізскіх душ [9, арк. 4], а ў арэндным ад скарбу маёнтку Мухаеды – 331 душа [9, арк. 2, 392].

Ігнат Тадэвушавіч Горват (1764 – каля 1820), дэпутат дваранства (вывадовы дэпутат) Рэчыцкага павета ў 1795–1801 гг., валодаў спадчынным маёнткам Карані (у Рэчыцкім павеце), дзе ў 1808 г. было 956 рэвізскіх душ сялян, а ў 1811 г. – 1010 душ: вёскі Карані, Нябыта (ці іначай – Ліпаў), Пырхі, Многавершы, Хамічы, Косетаў, Мартынавічы, Карпавічы, Ператок, Раковін, Рудня Яўтушкавіцкая, Марморычы, Зарэчча і Жэрдзі [10, арк. 393 адв.]. У 1811 г. ён купіў у Рэчыцкім павеце вёску Грады (Града – у цяперашнім Хойніцкім раёне Беларусі) у Андрэя Мацвеевіча фон Гольста (з яго маёнтка Барбароў) у вечнае і спадчыннае валоданне – 70 душ [10, арк. 350], таму ў Ігната Горвата ў 1814 г. сукупна мелася 1078 душ [11, арк. 179 адв.].

Мы не знайшлі архіўных крыніц аб куплі ў 1816 г. Ігнатам Горватам усяго вялікага маёнтка Барбароў (ці, прынамсі, яго часткі – мястэчка Нароўлі з навакольнымі вёскамі). Паводле рэвізіі 1816 г., Ігнат Горват меў у Рэчыцкім павеце маёнтак Карані (з належнымі вёскамі) – 831 рэвізская душа (237 двароў) [12, арк. 8–12 адв.], а маёнткам Барбароў (2127 душ, 896 двароў) валодалі сыны Андрэя фон Гольста – Якаў, Карл і Роберт [12, арк. 8–12 адв.]. У спісе ключвойтаўстваў Рэчыцкага павета ад 1823 г., за якімі замацавана пачарговае адбыванне стойкавай павіннасці памешчыцкімі сялянамі пры ніжнім земскім судзе, у Нараўлянскім ключы адказнымі асобамі пазначаны маянткоўцы Карл і Роберт фон Гольсты, а ў Даманавіцкім – маянткоўцы Ігнат Горват і Максім Апапеус (1748–1822), які памёр у Франкфурце-на-Майне [13, арк. 58]. Хутчэй за ўсё, інфармацыю ў дакумент ад 1823 г. аўтаматычна перанеслі з папярэдніх спісаў мясцовых маянткоўцаў, калі Ігнат Горват і Максім Апапеус былі жывымі.

Хутчэй за ўсё, Ігнат Тадэвушавіч Горват сапраўды памёр каля 1820 г., бо з архіўных крыніц бачна, што з 1822 г. усімі маёмаснымі справамі распараджаюцца яго сыны. 13 снежня 1822 г. рэчыцкі павятовы харунжы

(1820–1823) Аляксандр Ігнатавіч Горват (каля 1800–1888) аддаў губернскаму сакратару дваравіну Вінцэнту Маеўскаму ў заставу на тры гады 28 рэвізскіх душ вёскі Мартынавічы (якая адносілася да горватаўскага маёнтка Карані ў Рэчыцкім павеце) пад суму 10 000 рублёў асігнацыямі [12, арк. 2]. А 22 студзеня 1823 г. была зроблена інтрамісія (гэта значыць увод у валоданне) дваравіна Рамана Вяржбіцкага, гранічнага суддзі Ігуменскага павета, да фальварка Грады (таго самага, які ў 1811 г. быў куплены Ігнатам Горватам у Андрэя фон Гольста), бо Аляксандр Ігнатавіч Горват і Станіслаў Ігнатавіч Горват («годы паўналетнія маючыя») яго прадалі Вяржбіцкаму за суму 6000 рублёў срэбрам [12, арк. 2].

Нарэшце, захавалася архіўная інфармацыя, што 1 мая 1826 г. Вільгеміна фон Гольст (удава Андрэя фон Гольста) і яе дзеці (Якуб, Карл і Роберт фон Гольсты і іх замужняя сястра Вільгеміна Андрэеўна Бруцер (Brutier)) прадалі свой вялікі маёнтак Барбароў «з усімі прыналежнасцямі» (у тым ліку маёнтак Кажушкі) за суму 242 тыс. 650 рублёў срэбрам «спадчыннікам Ігната Горвата», гэта значыць родным братам Аляксандру, Станіславу, Атону і Даніэлю Ігнатавічам Горватам, а таксама іх замужнім сёстрам – падкаморыні Бабруйскага павета Францішцы Ігнатаўне Быкоўскай, маршалковай Мазырскага павета Марыяне Ігнатаўне Яленскай, харунжай Мазырскага павета Кацярыне Ігнатаўне Кеневіч і Філіпіне Ігнатаўне Горват (незамужняй сястры, якая пазней выйшла замуж за Ануфрыя Янавіча Венцлавовіча) [12, арк. 7]. Факт продажу быў спачатку зафіксаваны ў Галоўным судзе Ліфляндскай губерні (куды, верагодна, пераехалі спадчыннікі Андрэя фон Гольста), а пазней «з аплатай вячыстых пошлін» актыкаваны ў II дэпартаменце Галоўнага суда Мінскай губерні, і была прызнана інтрамісія [12, арк. 7]. Адсюль можна зрабіць выснову, што мястэчка Нароўля не было куплена ў 1816 г. Ігнатам Горватам, а ўваходзіла ў склад вялікага маёнтка Барбароў, купленага ў 1826 г. сям'ёй Горватаў, на чале якой стаяў старэйшы сын памерлага Ігната Горвата Аляксандр. Калі і меў Ігнат Горват намер купіць маёнтак Барбароў у фон Гольстаў, то ажыццявілі гэта толькі яго дзеці.

У спісе дваран Рэчыцкага павета, якія мелі права ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах у 1826 г., значацца паўналетнія браты Аляксандр і Станіслаў Ігнатавічы Горваты, а іх супольнымі, яшчэ не падзеленымі з іншымі братамі і сёстрамі ўладаннямі – буйныя маёнткі Ліпаў (указана замест ранейшага цэнтра – Каранёў) і Барбароў – з 2958 рэвізскімі душамі сялян (1133 двароў), з якіх сплачвалася падаткаў 20 173 рублі 56 капеек асігнацыямі ў год [12, арк. 8–12 адв., 20 адв.].

Падзельчы акт зямельнай спадчыны паміж братамі быў зроблены 31 сакавіка 1828 г. [14, арк. 1] і яўлены 10 ліпеня 1829 г. у Рэчыцкім павятовым судзе [15, арк. 2–2 адв.]. Аляксандр Ігнатавіч Горват (каля 1800–1888) атрымаў маёнтак Барбароў, Станіслаў Ігнатавіч Горват (1804–1884) – маёнтак Галоўчыцы, Атон Ігнатавіч Горват (1809–1894) – маёнтак Ліпаў, Даніэль Ігнатавіч Горват (1810–1868) – маёнтак Нароўля, а іх сёстры (Марыя,

Францішка, Філіпіна і Кацярына) атрымалі грашовыя фундушы. У тым жа 1829 г. землямерам Садольскім быў зроблены план адмежавання маёнтка Нароўля: 33 942 дзесяціны і 1217 сажняў зямлі [15, арк. 2–2 адв.]. Так мястэчка Нароўля стала цэнтрам асобнай латыфундыі, якая належала Даніэлю Горвату, яго сыну і ўнуку да 1917 г.

У 1834 г. у маёнтку Нароўля налічвалася 648 душ мужчынскага і 711 душ жаночага полу прыгонных сялян: мястэчка Нароўля, вёскі Кнyроўка (Кнураўка, цяперашняя Калінічы), Цешкаў, Карпавічы, Рудня Цешкаўская, Вязічы (Вязішча), Ламачы, Кажушкі, Перцы (Персаў), слабада Тартакі (Гамерня) і авульс (засценак) Фізінкі [15, арк. 2–2 адв., 34–43 адв.]. 24 студзеня 1841 г. Даніэль Горват купіў у Канстанцыі Казіміраўны Скірмунт (1808–1845) з роду Сулістроўскіх суседні маёнтак Каралін (цяперашні горад Ельск і наваколле) Мазырскага павета, дзе ў 1834 г. мелася 567 душ мужчынскага полу і 596 жаночага і, паводле вымярэння землямерам Ігнатам Шамбурскім ад 21 мая 1829 г., 22 697 дзесяцін і 1956 сажняў зямлі (ці, паводле «літоўскай меры», 1144 валокі, 5 моргаў і 186 прутоў) [15, арк. 6–7; 16, арк. 2 адв.]. Афіцыйна пакупная на маёнтак Каралін была складзена толькі 15 снежня 1849 г. [15, арк. 6–7].

Агульны прыбытак з маёнтка Нароўля ў 1834 г. складаў 15 684 рублі срэбрам: з продажу азімага і яравога хлеба, у прыватнасці вінакурэння – 8000 рублёў; з вырабу смалы і іншых лясных прадуктаў – 4200; з вышынку «гарачага віна» (гарэлкі) – 1209; з млына – 125; з продажу жывёлы, кармлёнай на бардзе (гэта значыць адходаў працэсу вінакурэння), – 950; з рыбнай лоўлі – 1200 [15, арк. 37]. А з маёнтка Каралін у 1834 г. – 12 550 рублёў срэбрам: з продажу азімага і яравога хлебу, у прыватнасці вінакурэння – 7600 рублёў; з вырабу смалы і іншых лясных прадуктаў – 3000; з вышынку «гарачага віна» – 900; з млына – 90; з продажу жывёлы, кармлёнай на бардзе, – 900 [15, арк. 42]. Гэта была тыповая спецыялізацыя феадальнай прыгонніцкай гаспадаркі буйных маёнткаў Мазырскага і Рэчыцкага паветаў у першай палове XIX ст.

У 1850 г. маёнтак Нароўля налічваў 645 душ мужчынскага полу і 33 942 дзесяціны 1217 сажняў абмеранай зямлі, а маёнтак Каралін – 567 душ і 21 977 дзесяцін 1326,5 сажняў (мястэчка Каралін, вёскі Багуцічы, Шарын, Вішэнкі, Дабрынь, Каралінская Буда (Данілаўка), Усохі і слабада Ілін) [15, арк. 19; 17, арк. 2–3]. Кошт маёнтка Нароўля ацэньваўся ў 60 тыс. рублёў срэбрам, а Караліна – 50 тыс. [17, арк. 2–3]. Даніэль Горват валодаў таксама невялікім маёнткам Арцюхі ў Мінскім павеце. У 1850 г. набыў маёнтак Прыборск і скончыў будаўніцтва ў Нароўлі новага мураванага палаца (у стылі позняга класіцызму), які стаў адной з самых шыкоўных і значных сядзіб ва ўсёй Мінскай губерні. У 1858 г. Даніэль Горват валодаў у Рэчыцкім павеце маёнткам Нароўля (388 рэвізскіх (мужчынскіх) душ і 500 жаночых душ), у Мазырскім павеце маёнткам Каралін (502 мужчынскія душы і 518 жаночых), у Радамысльскім павеце Кіеўскай губерні маёнткам Прыборск (949 рэвізскіх душ – Прыборск, Сукачы, Русакі, Даманаўка

(Даманаўск), Піраговічы, Балотня (Балотні), Варапаеўка, Вахоўка) [15, арк. 19; 18, арк. 1].

2 кастрычніка 1862 г. маёнтак Нароўля Даніэля Горвата налічваў 391 мужчынскую душу былых прыгонных сялян і 21 000 дзесяцін незаселенай зямлі [19, арк. 330]. Па слабасці здароўля Даніэль Горват у 1864–1865 гг. падзельным запісам аддаў кіраванне Нароўляй (33 942 дзесяціны) Артуру і Караліна (21 977) Маўрыцыю, а сабе пакінуў Прыборск і каштоўнасці, срэбра і мэблю з Нароўлі. Сыны мусілі выплаціць даўгі бацькі прыватным асобам (20 тыс. рублёў срэбрам) і займы ў Санкт-Пецярбургскім апякунчым савеце за Нароўлю (35 630 рублёў) і Каралін (39 690) [17, арк. 1–3]. Пасля сялянскай рэформы 1861 г. выкупны акт, напрыклад, Нараўлянскага сельскага таварыства (мястэчка Нароўля, вёскі Кныроўка і Ласка) быў падпісаны 31 ліпеня 1866 г., а ўводны ліст у валоданне зямлі сялянамі (2298 дзесяцін 1959 сажняў прыдатнай і непрыдатнай зямлі – за пазыковыя 24 518 рублёў 44 капейкі) – 17 сакавіка 1870 г. [20, арк. 167–168]. Пасля адмежавання сялянскіх надзелаў у нараўлянскім і каралінскім маёнтках Горвата заставалася каля 30 тыс. дзесяцін прыдатнай зямлі [17, арк. 2–3].

Даніэль Горват памёр 8 ліпеня 1868 г. у палацы дваран Хлапоўскіх – у вёсцы Чырвоная Весь (у Пазнанскай правінцыі Усходняй Прусіі), дзе жыла са сваім мужам Мацеем Хлапоўскім (1837–1883) яго дачка Марыя. Яшчэ ў лютым 1868 г., пасля прадстаўленага Даніэлем Горватам дазволу, пад кіраўніцтвам Станіслава Горвата (1804–1884) адбыўся падзел маёнткаў Даніэля Горвата паміж яго дзецьмі: Артур Даніэлевіч Горват (1831–1903) атрымаў маёнтак Нароўля, Маўрыцый Даніэлевіч Горват (1838–1903) атрымаў маёнтак Прыборск (які ён пазней прадаў рускаму двараніну Пацёмкіну), а пасля смерці Станіслава Горвата ў 1884 г. атрымаў яго маёнткі Галоўчыцы і Дудзічы, а Марыя Даніэлеўна Хлапоўская (1844–1906) атрымала маёнтак Каралін, які яна ў 1870 г. прадала рускаму дваранiну Івану Пятровічу Анзельму [21, арк. 1–2]. Першая жонка Артура Горвата (Гелена Войніч-Сянажэцкая) заўчасна памерла, але паспела нарадзіць двух дзяцей – Льва і Гелену. Таму яе маці (Леакадзія Львоўна Войніч-Сянажэцкая), каб не дзяліць свой маёнтак Дукора, вылучыла грашыма належны пасаг на імя свайго ўнука (Льва Артуравіча Горвата) – заёмны ліст на суму 50 тыс. рублёў срэбрам прадставіла ў 1856 г. у Мазырскім павятовым судзе [22, арк. 1–2].

У пачатку 1870-х гг. новы абмер нараўлянскага маёнтка выявіў няўлічаныя раней 74 % плошчы (балоты, балотны лес і інш.) і паказаў 44 495,54 дзесяціны [23, с. 171]. 10 жніўня 1876 г. у Пінску быў падпісаны кантракт, якім Артур Даніэлевіч Горват аддаваў дваранiну Пінскага павета Францішку Юліянавічу Кеневічу свой маёнтак Нароўля (паша, вінакурня, цагельня і г. д.) у арэнду з 1 красавіка 1877 г. па 1 красавіка 1889 г.: Кеневіч штогадова павінен быў плаціць 3 тыс. рублёў срэбрам – 1 красавіка і 1 кастрычніка па 1500 рублёў [24, арк. 1–2]. Аднак арэнда ў 1877 г. была датэрмінова скончана [23, с. 171].

Пасля падачы просьбітамі афіцыйнага звароту 24 лютага 1884 г. расійскі імператар звольніў з расійскага падданства жыхара Варшавы двараніна Артура Горвата, яго жонку Караліну (Шарлоту), дачку Францішку і Габрыэлю, ім было выдана пасведчанне на заўсёднае перасяленне ў Германію [25, арк. 4]. У другой палове 1884 г., знаходзячыся за мяжой Расійскай імперыі, Артур Горват прыняў аўстрыйскае падданства, 23 снежня 1884 г. атрымаў аўстрыйскі пашпарт, а ў лютым 1885 г. вярнуўся ў свой маёнтак Нароўля [25, арк. 1]. У 1890-я гг. ён падпісваў у Познані даверанасць кіраваць нараўлянскім маёнткам свайму пленіпатэнту Юзафу Андрэевічу Ляневічу, а 24 красавіка 1901 г. у Познані падпісаў даверанасць кіраваць маёнткам Вітальду Юзафавічу Зяновічу [26, арк. 1; 27, арк. 165]. Артурам Горватам у верасні і снежні 1901 г. былі куплены для нараўлянскага маёнтка адпаведна паравы кацёл і медныя трубы [28, арк. 10, 13].

Эдвард Артуравіч Горват (1866–1935) скончыў у 1889 г. Рыжскае палітэхнічнае вучылішча са ступенню агранома, у 1890 г. стаў членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ), у 1897–1901 гг. быў дэпутатам дваранства Мазырскага, у 1901–1917 гг. – Рэчыцкага павета, а ў 1903 г. атрымаў у спадчыну нараўлянскі маёнтак [29, арк. 81–82; 30, арк. 1 адв.–3]. Яшчэ пры жыцці свайго бацькі Эдвард Горват у 1890-я гг. правёў новыя будаўнічыя мерапрыемствы па ўпрыгожванні палаца ў Нароўлі, а асабліва маштабныя пераўтварэнні ў маёнтку праводзіліся ў 1902–1914 гг. У 1909–1910 гг. Эдвард Горват прадаў звыш 16 862 дзесяцін (лесу і ворных зямель) са свайго нараўлянскага маёнтка [31, арк.1–63, 101–102]. Паводле фармулярнага спіса аб службе за 1914 г., нараўлянскі маёнтак Эдварда Горвата налічваў 28 тыс. дзесяцін зямлі [30, арк. 1 адв.–3], а паводле календара «Над Свіслаччу» (1914) – 16 678 дзесяцін зямлі, абкладзенай земскім падаткам [32, с. 107].

Менавіта Эдвард Горват сваімі прадпрымальніцкімі здольнасцямі і шыратой погляду канчатковаператварыў маёнтак Нароўля з былой феадальнай латыфундыі ў значны капіталістычны індустрыяльны цэнтр Мінскай губерні: меўся завод па вырабу паташу, дзёгцю, цэглы, шклозавод, малатарня, млынарня, валоўня, Міхнаўскі сенапрасавальны завод, конезавод, лесапільня, прадпрыемства па вырабу сокаў і варэння, прыватная лінія чыгункі для вывазу лесу, прыстань на транспартнай магістралі – рацэ Прыпяць; выраблялі гарэлку, каўбасы, сыры, рыхтавалі вяндліну. У 1913 г. каля свайго нараўлянскага палаца Эдвард Горват пабудаваў кандытарскую фабрыку (выраблялі мармелад, карамель, пасцілу, павідла, джэм і сочыва), а ў 1914 г. у Расійскай імперыі была зарэгістравана гандлёвая марка «Горват». На прадпрыемствах Горвата за грошы працавалі як мясцовыя наёмныя работнікі, так і замежныя спецыялісты (немцы) [33]. Паводле Мечыслава Ялавецкага, найбліжэйшымі супрацоўнікамі кіраўніка МТСГ Эдварда Вайніловіча былі Раман Скірмунт, Караль Незабытоўскі, Міхал Ленскі, Яўстах Любанскі, Ежы Чапскі, Ігнат Віткевіч, Міхал Валовіч, Эдвард Горват, Пётр Ванькові, Вільгельм Ельскі і Караль Свяцкі [34]. У 1917–1920 гг.

зямельныя ўладанні і палацы Горватаў у Мінскай і Кіеўскай губернях былі нацыяналізаваны савецкай уладай без кампенсацыі былым уласнікам.

Такім чынам, нараўлянскі маёнтак стаў прыкладам эвалюцыйнага пераўтварэння феадальнай латыфундыі ў значны капіталістычны маёнтак з развітай спецыялізацыяй, дзе побач з традыцыйнымі галінамі (земляробства, жывёлагадоўля, рыбалоўства, вінакурэнне, нарыхтоўка драўніны, паташу, дзёгцю, вырабу руды і шкла) на працягу XIX – пачатку XX ст. заснаўваліся мануфактурныя і фабрычныя прадпрыемствы, што было рэалізавана дзякуючы сучаснай адукацыі, крэдыту, продажу лішкаў зямлі і прадпрымальніцкім здольнасцям уладальнікаў. Менавіта такія эканамічныя цэнтры ў многім вызначалі шляхі капіталістычнай мадэрнізацыі эканомікі Беларусі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Jelski, A.* Narowla / A. Jelski // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego. – T. VI: Malczyce – Netreba. – Warszawa, 1885. – S. 917.

2. *Urbański, A.* Podzwonne na zgliszczach Litwy i Rusi / A. Urbański. – Warszawa: St. Niemiry Syn, 1928. – 161 s.

3. *Aftanazy, R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej: w 11 t. / R. Aftanazy. – 2-e wyd. – Wrocław [etc.]: Ossolineum, 1991. – Cz. 1. – T. 1. – 352 s.

4. *Адамович, С.* Дворец в Наровле: история и реалии / С. Адамович // Архитектура и строительство. – 2010. – № 2. – С. 58–61.

5. Нацыянальны гістарычны архіў у г. Мінску (далей – НГАБ). – Ф. 1728. Воп. 1. Спр. 24.

6. *Радзюк, А. Р.* Пад скіпетрам Расійскай імперыі: рэпрэсіўная палітыка царызму на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / А. Р. Радзюк. – Гародня-Кракаў, 2017. – 196 с.

7. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 62.

8. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 1946.

9. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 262.

10. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 261.

11. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 2. Спр. 13.

12. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 76.

13. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 48.

14. НГАБ. – Ф. 146. Воп. 2. Спр. 3542.

15. НГАБ. – Ф. 146. Воп. 2. Спр. 1119.

16. НГАБ. – Ф. 146. Воп. 2. Спр. 3412.

17. НГАБ. – Ф. 146. Воп. 2. Спр. 2673.

18. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 28.

19. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 3. Спр. 135.

20. НГАБ. – Ф. 707. Воп. 1. Спр. 2.

21. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 33.

22. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 53.

23. *Кохнович, В. А.* Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. / В. А. Кохнович. – Saarbrücken: Lambert Academic Publishing, 2015. – 358 с.

24. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 45.

25. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 2. Спр. 8729.
26. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 50.
27. НГАБ. – Ф. 1071. Воп. 1. Спр. 1.
28. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 54.
29. НГАБ. – Ф. 1043. Воп. 1. Спр. 3.
30. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 3. Спр. 1051.
31. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 4. Спр. 14234.
32. «Nad Świsłoczą»: kalendarz miński informacyjny na rok 1914 / pod red. W. Dworzaczka. – Wilno: Znicz, 1914. – 130 s.
33. НГАБ. – Ф. 986. Воп. 1. Спр. 79–216.
34. *Jałowiecki, M.* U Edwarda Woyniłłowicza / M. Jałowiecki // Wiadomości. – Londyn, 1958. – № 18. – S. 2.

**(Дата падачы: 21.02.2024 г.)**

*Д. О. Рубисов*
Белорусский государственный университет;
Национальный исторический архив Беларуси, Минск

*D. Rubisov*
Belarusian State University; National Historical Archives of Belarus, Minsk

**УДК 94(474/476):27**

## ВЗАИМООТНОШЕНИЯ ПРАВОСЛАВНОЙ И КАТОЛИЧЕСКОЙ КОНФЕССИЙ НА ТЕРРИТОРИИ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В XV В.: РОЛЬ СОБОРНОГО ДВИЖЕНИЯ В ОТНОШЕНИИ К УНИИ

## THE RELATIONSHIP BETWEEN ORTHODOX AND CATHOLIC CONFESSIONS IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 15TH CENTURY: THE ROLE OF THE CATHEDRAL MOVEMENT IN RELATION TO THE UNIA

*В статье уделяется внимание взаимоотношениям Киевской митрополии с римской курией, влиянию общеевропейских церковных и политических проблем на взаимоотношения христианских конфессий в Великом княжестве Литовском в XV в., общеевропейских вопросов церковного объединения на политику монархов Великого княжества Литовского в отношении церковной унии, отношению Католической церкви на территории княжества к проблеме церковного объединения на фоне концилиаристского (соборного) движения в Католической церкви.*

*Ключевые слова: Великое княжество Литовское; Киевская митрополия; церковная уния; Ягеллоны; духовная иерархия Великого Княжества Литовского; соборное движение; Православная церковь; церковная история; Ферраро-Флорентийский собор; великий князь литовский.*